

# ЧАРЭЯ І БЕЛАЯ ЦАРКВА Ў МАЛЮНКАХ І ЎСПАМІНАХ

## ШАЛАВАТКА

*Вы знаете, там было две горы. Одна называлась Шалаватка. А вторая гора была Татарка. Ну и туда пойдёшь на эту гору – высоко-о! Ходишь. А там росли такие ягоды лесные, траскуницы. Их когда кушаешь, они трещали. Это хорошее было место. Там была брусчатка, на той улице, до Шалаватки. И баба Уля рассказывала, как шли молодые дамы в длинных платьях с зонтиками на эту Шалаватку.*

*Софья Александровна Драгун*



## ГАРАДЗІШЧА

Вы – у пункце, з якога пачалася Чарэя. Тое, што ўзгорак ля ўскраіны мястэчка, – гарадзішча, вызначыў археолаг Еўдакім Раманаў. Мяркуюць, што людзі пачалі жыць ля гэтага ўзвышша да X стагоддзя, а за сценамі гарадзішча яны адно хаваліся ад пагрозаў.

На вяршыні гарадзішча – старыя могілкі. Яны захоўваюць дзівоснага характва каваныя крыжы XVII–XX стагоддзяў – сонцакрыжы чарэйскіх майстроў. У сімвалічнай палітры гэтых твораў закадаваныя гісторыі пра ўзыходжанне Хрыста-сонца над светам, касмаганічныя ўяўленні знітаваныя з хрысціянскімі. Да гучання ансамблю памяці вас уздыме лесвіца, што ўзыходзіць на вышыню васьмі метраў на паўночным схіле.

## ШАЛАВАТКА І ТАТАРКА

Адна з чарэйскіх легендаў распавядае пра шалаватаў, мясцовае старажытнае племя, і татараў. Нейк сышліся яны ў бітве, а пасля хавалі сваіх загінулых на розных берагах ракі: насілі зямлю ад возера, сыпалі ды сыпалі, пакуль не выраслі два высокія курганы. Рака з цягам часу знікла, курганы ж – Шалаватка і Татарка – сталі стагоддзямі.

Зімою 2005 года Шалаватку ператварылі ў газатрасу: курган разрылі ды вывезлі на будаўніцтва. Тады ў яго зямлі знайшліся частка каменнага малатка і гліняныя чарапкі – аскепкі старажытнасці, што цяпер захоўваюцца ў музеі Чарэйскае бібліятэкі.

А Татарка жыве – справа ад гарадзішча, наводдалек, дзе відаць верхавіны дрэваў.



*Маковееву крыницу надо найти. Водичка такая, стоит как зеркало, такая зелень кругом, всё закрыто кустами. И потом оттуда – Буль! – такой пузырь. Круги разбежались, разбежались, и опять тишина.*

*Татьяна Михайловна Козловская*

## ТАТАРКА

# ЦАРКВА СПАЧЫНУ БОЖАЕ МАЦІ



Паводле краязнаўцаў, бажніцу Спачыну Божае Маці маглі пабудаваць на гэтым пагорку яшчэ ў XII стагоддзі. Царква ўпершыню згадваецца ў другой палове XIV стагоддзя ў «Запісках...» княгіні Ульяны, жонкі вялікага князя літоўскага Альгерда.

У другой палове XVIII стагоддзя грэка-каталіцкая ў той час святыня, аднаўленая пасля пажару, была драўлянаю і з трыма вежачкамі.

*Тварог тут дзелалі і сушылі. Ён жоўты такі і як фасоль кусочкамі. На простынях на горке, калі пагода хорошая і сонца, яго насыплюць у палец і яно сохнець. А старшыя за мяне мне гавораць: ідзі прынясі яго. Дык я разы тры хадзіў. На горку паўзеш эту, улезеш і ў шапку ці што-небудзь, і кулік сюды дамоў. А еслі хто ўвідзець, ну пакрычыць. А што тут – дзеці ж. А твораг гэты ўкусны быў! Як сыркі во прадаюць. Ліпнець ва рту, бо не дасох.*

*Леонид Степанович Шайковский*



Пры канцы XIX стагоддзя царкву, ужо праваслаўную, зноўку страцілі праз агонь і зноўку адбудавалі з дрэва. У пачатку XX стагоддзя пасля чарговага пажару на тым самым месцы з'явілася каменная бажніца – з белацаркоўскае цэглы паводле праекта архітэктара Пятра Камбурава.

Бажніцу зачынілі ў 20-я гады XX стагоддзя. У 1943 годзе яе спрабавалі падарваць, але сцены вытрывалі, абвалілася толькі столь. Пасля другой сусветнай вайны царкву разабралі на цагліны для гаспадарчых патрэбаў. Да нашага часу захаваліся рэшта яе фундамента і народны назоў – Прычэсцінка.

*Цэрква эта не такая старая, маладая, ана не многа пабыла. Для страіцельства іспользвалі кірпіч. Кірпіч называўся «БЦ». Кляймо там такое есць. Яго ў Белай Цэркві дзелалі. Адтуда вазілі эты кірпіч сюда, для страіцельства. Больш яго нідзе не відна было. А цяпер яго ўсюды паўно, тамушта цэркаў разабралі і па ўсей акруге іспользвалі.*

*Владислав Феофилович Сорочинский*

*Так пасля вайны сталі строіцца: лес ёсць, а кірпіча здзелаць печку нету. А тагда цэркві што? Бацюшак-папоў разагналі і сталі проціў цэрквы. Ну і тады первы хто ўзяў кірпічы з цэрквы. А як ён узяў, дык і бярыце ўсе. Да фундамента разабралі. А сцяна была метр таўшчынёй.*

*Леонид Степанович Шайковский*

*Пасля рэвалюцыі цэркаў не работала. Малако тут прынімалі, сепаратары стаялі, раздзялялі малако на сываратку і смятану.*

*Владислав Феофилович Сорочинский*



# ЦАРКВА СВЯТОГА МІХАЛА АРХАНЁЛА (УВАСКРЭСЕНСКАЯ)

У пачатку XVII стагоддзя ў Чарэі пабудавалі адну з першых у Вялікім Княстве Літоўскім уніяцкіх бажніц. Царква з'явілася дзякуючы Льву Сапегу, які бачыў у Берасцейскай уніі шлях да незалежнасці княства.

Вядома, што пры канцы XVIII стагоддзя бажніца – магчыма, перабудаваная – была драўлянаю і з дзвюма вежачкамі. Царкву страцілі ў пажары, і Наталля Мілаш пастанавіла вярнуць яе мястэчку: перад вамі цагляныя ўжо сцены, што ўзводзілі ў 1824 годзе, але, магчыма, з увагі на архітэктурныя традыцыі княства XV–XVI стагоддзяў.

У часе скасавання ўніі царкву зрабілі праваслаўнай.
У 1935 годзе бажніцу зачынілі, і чарэйцы захоўвалі абразы ў сваіх дамах. Службы аднавіліся ў 1942–1943 гадах. У 1956 годзе святыню ператварылі ў склад. З канца 90-х у царкве зноў адбываюцца набажэнствы.

*А Михайловская церковь была такая красавица! Построенная при Сапегах. На горке стоит, купола позолоченныя, и кругом высажены каштаны.*

*Софья Александровна Драгун*

*Міхайлаўскую цэркву сталі разбіраць – а там раствор крэпча, чым кірпічы, кірпіч ломіцца і не йдзёць. Так яна і асталася. Здзелалі там склад саўхозны, зярно хранілі. Ну бацюшкі цяпер ужо адстаялі, падрэманціравалі, і стаіць цэркаў, работаець.*

*Леонид Степанович Шайковский*



# КАСЦЁЛ СВЯТОГА МІХАЛА АРХАНЁЛА

Мяркуюць, што першы касцёл з дрэва ў Чарэі пабудаваў на пачатку XVII стагоддзя Леў Сапега. У бажніцы змясцілі візантыйскі абраз святога Міхала Арханёла, што з часам прызналі цудатворным. Касцёл тройчы гарэў і аднаўляўся. Фотаздымкі данеслі да нас белы карабель віленскага класіцызму, створаны ў 1828–1837 гадах і адбудаваны пасля пажару 1859 года, – з скульптурамі Хрыста і анёлаў на вяршыні трохкутнага франтона. У касцёле, акрамя ўжо згаданага абраза святога Міхала, захоўвалася яшчэ адна выява, што рабіла цуды, – абраз Божае Маці, прывезены ксяндзом Ігнатам з украінскага кляштара.

Унутры бажніцу аздаблялі драўляныя фігуры святых, люкарна ў барочным алтары, сугучная люкарне над увахадам, арган.



У 1790-х чарэйскім ксяндзом быў Геранім Гарабурда – вядомы беларускі прафесар, выкладнік, філосаф. А ў 1836 годзе ў касцёле хрысцілі Стэфана Данісевіча, біскупа, які прывёў у каталіцкае жыццё краіны беларускую мову.

Святары, якія служылі ў касцёле з канца 1890-х да канца 1920-х гадоў, былі рэпрэсаваныя савецкімі ўладамі. Бажніцу саветы ператварылі ў кінатэатр. У 1943 годзе святыню ўзарвалі партызаны, а па другой сусветнай вайне з яе цэглы ў мястэчку збудавалі школу.

*Когда не стало церквей, тут с костёла сделали такой замечательный кинотеатр! Это было просто как город! Фильмы крутили детския, и взрослыя, и с утра, и повторныя фильмы.*

*Софья Александровна Драгун*

*У касцёле кіно гналі. Сядзелі, паўно дзяцей і ўзрослыя, глядзелі. Глядзіш на экран, што паказвалі, камушкамі другі раз кідаеш. Балавалісі.*

*Владимир Андреевич Минович*



*Там і кіно паказвалі, і клуб быў. Арцісты сцэны выступалі, і із народа арцісты тожа.*

*Леонид Степанович Шайковский*

*Я відзеў, як унічтажалі касцёл. Унічтажалі партызаны. Падлажылі туда тол, узарвалі. І я відзеў, як стоўп пылі во так во падняўся высако, апусціўся – усе сцены паваліліся. Эта зданіе слабае было. Так і ляжала, пакуда і яго на печы не разабралі.*

*Владислав Феофилович Сорочинский*

# ЛЯКАРНЯ

Першы вядомы «свой» доктар – Фёдар Міхайлавіч Раманаў – з'явіўся ў Чарэі ў 1906 годзе. За некалькі гадоў да гэтага, пры канцы XIX стагоддзя, у мястэчку пабудавалі лякарню, куды ён прыехаў працаваць фельчарам. Яе будынак – з чырвонае цэглы, з сценамі метровае таўшчыні, што памятаюць шмат гісторыяў ацалення, – захаваўся да нашых дзён.

У 1926 годзе побач узнік большы будынак. Падчас другой сусветнай вайны, калі ў ім месціўся вайскови шпіталь, быў спалены, але хуткім часам адноўлены. Цяпер гэта амбулаторыя.



*Каля бальніцы мост быў дзеравянны. Туда сабіраліся. Танцаваць жа не было дзе, без пола былі дамы. Так во мост пастроілі, сабяруцца і танцуюць. Мост шырокі быў. І во хто паёць, хто танцуець.*

*Леонид Степанович Шайковский*

# ПАЖАРНЫ ДОМ



Дом для пажарнай дружыны з'явіўся ў Чарэі як у найбуйнейшым мястэчку Сенненскага павета пры канцы XIX стагоддзя. Побач з будынкам для ратаўнікоў-ахвотнікаў на плошчы паставілі бочкі з вадою і канюшню – коні дапамагалі дастаўляць бочкі да месца, дзе трэба было гасіць агонь. Плошчу пачалі называць Пажарнаю.

Будынкаў з гэткай прыгожай цаглянаю муроўкаю ў Чарэі было два, захаваўся адзін. Яго рупліва адрэстаўравалі дзякуючы краязнаўцу Раальду Раманаву, вярнуўшы сценам часцінкі адколатых цаглінаў.

*Пажарная была на конях. Уручную нада было. Спецыяльныя на целеге бочкі былі, і эты насос. Пасля вайны адзін пажар мне запомніўся. Я тады збегаў паглядзець. Двое качаюць, а эты шланг цягаець, і еслі нада куды бліжэй, так на пажары ж людзей многа – таўкануць этыя калёсы і ўсё.*

*Леонид Степанович Шайковский*

*Сталовую ўжо у пяцьдзясят васьмым гаду, дзе зараз пажарны дом, адкрылі. Чатыры сталы было па чатыры месты. Вот табе пажалста, чатырыжды чатыры – шаснаццаць. Шаснаццаць чалавек едзінаўрэменна ўжо маглі пакушаць, піва маглі папіць.*

*Сергей Степанович Гапанович*



# КЛАДЗІШЧА (ГАБРЭЙСКІЯ МОГІЛКІ)



Вы ў сэрцы сакральнага месца – габрэйскіх могілак. Гэта самы стары і самы вялікі некропаль Чарэі, што некалі пачынаўся ў цэнтры мястэчка: за сінагогаю, ля фундамента міквы і сёння пераглядае некалькі надмагільных плітаў. Для часткі могілак, якая захоўвае найбольш мацэваў, у чарэйцаў ёсць асобны назоў: Кладзішча.

Помнікі шукайце з абодвух бакоў ручая – аскетычныя, прастакутныя, з аркавымі ды асіметрычнымі верхнімі часткамі, бачныя адразу і прытоеныя, што выступаюць з зямлі адно ўрыўкамі эпітафіяў, быццам вадзяныя люстэркі з надпісамі на іўрыце.

*Тут вот близко, так раньше*
*мы пойдём на эти кладбища*
*и смотрим, как их хоронять.*
*Нас они не пускали, но мы дети*
*любопытные были, прибежим.*
*Обыкновенно вырываюць яму,*
*в саван белый ложать, а потом*
*очертания лица робять: землю*
*на глаза, на нос и на губы, –*
*и зарываюць так.*

*Софья Александровна Драгун*

# ЦЕНТР

*Сапожных было дзве. Адна была во дзе почта ў нас зараз. Там чалавек дзесяць работала. А другая сапожная – во дзе ідзець асфальт-дарога і паварот на Лугавую.*

*Ящчэ кожы выраблялі, эта к озеру там дальша. Небальшое зданіе было, метраў двадцаць-трыдцаць. Бочкі стаялі на двара. Туды эту кожу кідалі, а потым сушылі. З авец шубы шылі, кажухі.*

*Вот эта Лукомльская улица, что к больнице идет, была отсюда арка и проход туда. Старики говорили, что ресторан был, а под ним арка, и можно было пройти на ту улицу.*

*Здесь был ресторан когда-то. Внизу был большой подвал, а наверху карчма. Но не очень-то большая. Стола на четыре.*

*А вот эта сторона вся была в каштанах. И там еще стояли такие чаны дубовые. Шкуры замачивали и вырабатывали пергамент для тор. Торы писали на специальном пергаменте, скрутках, «обоях» как здесь говорят. Его определенным образом вымачивали, отскребали, он такой тонкий получался. Вырабатывали здесь эти скрутки испокон веков на улице Лукомльской.*

*Во эты склад ля клуба – ён быў двухатажны, дзеравянная надстройка была, і там шылі. Бяльё, адзежду. Я з мацер'ю дык дажа і захадзіў туды*

*Там такія магазінчыкі стаялі наўрад, адзін каля аднаго. Там зярно здавалі людзі.*

*Евреи себе выстроили баню вот тут, совсем недалеко, на городской тип. Во фундамент остался на Школище. Прибежишь, пять копеек отдаси, мойся хоть ты я не знаю сколько! И тазики, и такие скамеечки, и пол.*

*Яшчэ кожы выраблялі, эта к озеру там дальша. Небальшое зданіе было, метраў двадцаць-трыдцаць. Бочкі стаялі на двара. Туды эту кожу кідалі, а потым сушылі. З авец шубы шылі, кажухі.*

*А там, где контора, был базар. Всё было забито этими камнями — брусчаткой. И там стояли лавки, столы, люди приезжали на конях продавать тоже.*

*А там дальше был сельский совет, дом такой трохатажный. До революции там жили богатые люди.*

*Тут во дзе на цэнтры домік стаіць, дзе паварот, тут стаяла вучыцельская, а во там дальша домік стаіць – там была яўрэйская школа стаяла, і руская школа была. Там каштаны раслі, плашчадка была.*

*Там клуб такі на цэнтры стаяў дзеравянны – там не дай бог! Там стока наб'ёцца маладзёжы, што пар ідзём, дзверы раскрыты, як усё раўно ў бані. І кіно там пускалі, і танцы ўвечары. Цэлая каша была!*

*А на Луговой улице стоял заводик, который делал казеиновый клей. Дерево им клеили, черный такой, из обезжиренного творога его делали*

*А там, дзе у нас цэнтр, во дзе дзярэўя, магазіны былі пад адной крышай. Усе на адну сторану, толькі дзверы разныя. І прыпаднятыя былі санціметраў сорак.*

*Кузні былі пашці на каждай вуліцы. На Лукамскай, Гарадской, тут у цэнтры была. У кузні абычна былі яўрэі кузнецамі. І ўсе хвалілі, што дужа харошыя. Адносіш работу, што ні зделаюць – харашо. У асобеннасці плугі мужыкі хвалілі. Што як зделаюць плуг – харашо ідзець. Во эта кузнец!*

*И вот тут были детские дома. Детей там было около пятисот. Два дома таких большущих они заполняли. Дома стояли туда к озеру.*

*Мельніца была бальшая. Вазілі малоць з усёй акругі. А на мельніцы быў генератар пастаўлены. І генератар эты даваў свет на ўсю Чарэю. Во так. Мельніца работаець і вырабатываець свет.*

*І па вуліцы правялі лінію электраперадач, сталбы паставілі, і па ўсей Чарэі свет быў электрычаскі ад мельніцы.*

*Тут свой жа хлеб пеклі. Ой, які белы хлеб! Булка такая во высокая, такая во здаровая, а як сціснеш – яна во, адпусціш – апяць расцець такая бальшая. Такі ўкусны хлеб пяклі!*

*Пякарня ў нас тут была адна, втарая, да вайны ящчэ інвалідская была пякарня. Людзі на ней старыя работалі, інваліды. Яны работалі і хлеб пяклі, развазілі ў магазіны.*



*Черея — это была не деревня, это было местечко. Если крупное население, больше двух тысяч человек, – уже называлось «местечко».*

*Там было на цэнтры ўсё застроена, адно к другому: во адзін дом, ізгарадзь упрытык, другі дом. Свабодных месц не было, усё было застроена.*

# ПОМНІК АХВЯРАМ ГАЛАКОСТУ

У Чарэі здавён жылі габрэі. У пачатку 40-х гадоў XX стагоддзя габрэі складалі бальшыню яе насельніцтва. 5 сакавіка 1942 года адбылося жахлівае: амаль усе яны былі расстраляныя. Пасля другой сусветнай вайны ніводнага габрэя ў мястэчку не засталося. Праз расавае вар'яцтва і страх утварылася пустэча, якую немагчыма запоўніць. «Даліна Знішчаных супольнасцяў» музея Яд Вашэм захоўвае памяць пра чарэйскую трагедыю.



ОЧЭНЬ МНОГА ЯЎРЭЯЎ БЫЛО. НЕ ДАЙ БОГ... ■ УСІХ, І МАЛАДЗЁЖ, І СТАРЫКОЎ, УСІХ ІХ ВАЗІЛІ, ВО ТУТ НЕДАХАДЗЯ БЫЎ КНІЖНЫ МАГАЗІН ДАРЭЧЫ, ЗІМОЙ, ЭТА КАК РАЗ БЫЎ СОРАК ВТАРЫ ГОД УЖО, ІХ РАССТРЭЛІЛІ ЎСІХ НЕМЦЫ. АСОБЕННА КАЛІ Ў ДОМЕ РАССТРЭЛЬВАЮЦЬ, КРЫК, ГВАЛТ БЫЎ – ВААБШЧЭ НЕ ДАЙ БОГ. А ПАТОМ ПЕРАВАЗІЛІ ІХ ТУДА. ТАМ БЫЛА КАЛХОЗНАЯ СВІНАРНАЯ ЯМА, І ЯНЫ ІХ ТУДА УСІХ ЗБРОСІЛІ. І ЯНЫ ТАМ... ■ ЯК ВЯЛІ ІХ... ВЯДУЦЬ, А ТАМ ДЗЯЎЧАТЫ І ДЗЕЦІ, УСІХ З ХАТЫ ВЫВАДЗІЛІ, І ТАМ НА ХАЛЬНЯВІЧСКАЙ ВУЛІЦЫ, ПА ЛЕВАЙ СТОРАНЕ, ТАМ ТОЖА ДЗЕТА ІХ СТРАЛЯЛІ. ТАКОЕ ЎРЭМЯ БЫЛО, ШТО ВАЙНА І ГІТЛЕР ДАЎ КАМАНДУ ІХ УНІЧТОЖЫЦЬ... ■ ПЯТАВА МАРТА. ПЯТАВА МАРТА АНІ ІХ БІЛІ. МАРОЗ БЫЎ СІЛЬНЫ – СОРАК ГРАДУСАЎ. КАМАНДА БЫЛА ЗАКРЫЦЬ УСЕ САРАІ, ТО-ДРУГОЕ, КАБ ЖЫДЫ-ЯЎРЭІ НІДЗЕ НЕ ПРАТАЛІСЯ, І УСІХ З ХАТ ВЫВАДЗІЛІ І СТРАЛЯЛІ. УСЁ. СТРАШНА БЫЛО... ■ ТУТ БЫЛО СЕМЬДЕСЯТ ПРОЦЕНТОВ ЕВРЕЕВ, А ОСТАЛЬНЫЕ – БЕЛАРУСЫ. И ОНИ ИХ ПРЯМО УТРОМ ПОРАССТРЕЛИВАЛИ. ЗА СТОЛОМ. ВСЕ ЗАВТРАКАТЬ СЕЛИ, И ОНИ ЗАХОДЯТ - И ИХ С АВТОМАТОВ. И ОНИ ЛЕЖАТ И ЛЕЖАТ. ПОТОМ ЛЮДИ ИХ ТЕЛА НА САНКИ БРАЛИ И ВОН ТУДА ОТВОЗИЛИ. ЯМУ ВЫКОПАЛИ – И ТУДА. Я ПАЦАНОМ БЫЛ. НАМ ЗАПРЕЩАЛИ БЕГАТЬ ТУДА. ПОТОМУ ЧТО ОНИ СТРЕЛЯЮТ, И ТЫ ПОД ГОРЯЧУЮ ЕЩЕ ПОПАДЕШЬ. ТАК И НЕ ПУСТИЛИ. СЕМЬДЕСЯТ ПРОЦЕНТОВ ЕВРЕЕВ БЫЛО, А ПОСЛЕ ВОЙНЫ – ТРИ ШТУКИ. ■ ЯЎРЭІ ЗНАЛІ, ШТО БУДЗЕЦЬ ЯКІЙ-ТО КРАХ. БІБЛІЮ, МОЖА, ЧЫТАЛІ, НЕ ЗНАЮ. І ДУЖА БАЯЛІСЯ. ЕСЛІ НАЧНЕЦЦА ВАЙНА Ў ПАНЯДЗЕЛЬНІК, ТО ЗНАЧЫЦЬ ІХНЮЮ РАСУ ЯЎРЭЯЎ ПАСТРАЛЯЮЦЬ. ЯНЫ ЎЖО ЗНАЛІ ГЭТА... ІХ САБІРАЛІ Ў ЗДАНІЯ ПУСТЫЯ І ВЯЛІ КАЛОНАЙ. І Ў КАНЦЫ ВУЛІЦЫ, ТАМ ДЗЕ Ў НАС СІЛОСНАЯ ЯМА, ІХ СТРАЛЯЛІ. ЯМА МОЖА ТРЫ ДНІ ХАДЗІЛА ХОДАРАМ. А ТАДЫ ПРЫВЯЗЛІ НЕЙКІХ БРАВЁН, НАКІДАЛІ НАВЕРХ І ЧЫМ-ТА АБЛІЛІ, КАБ ТРОХУ ЗЖЭЧ. ■ ЯЎРЭІ Ў НАС РАБОТАЛІ ЎСЮДЫ: ПА МАГАЗІНАХ У НАС БЫЛІ АДНЫ ЯЎРЭІ. АПЦЕКÁР БЫЎ ХАРОШЫ. ЯМУ ПРЫКАЗ ПРЫЙШЛІ: АПЦЕКÁРА АСТАВІЦЬ. ЖОНКУ, СЯМ'Ю РАССТРАЛЯЦЬ, А ЯГО НЕ. ТАК ШТО ЁН БУДЗЕЦЬ АСТАВАЦЦА? КАЖА: "НЕ АСТАЮСЯ Я НІ З КІМ, Я СА СВАІМІ БУДУ". І САМ ПАЙШОЎ НА РАССТРЭЛ. ■ ЕСЛІ Ў КАТОРЫХ ОБУЎ БЫЛА ПАДХАДЗЯШЧАЯ, ТАК ДАЖА ПЕРАД ЯМАЙ МАГЛІ РАЗУЦЬ, А БОСАГА РАССТРАЛЯЦЬ. ДУЖА СТРАШНА. НЕ ДАЙ БОГ. ■ Я КОГДА ДЕВЯТЫЙ КЛАСС ОКАНЧИВАЛА, У НАС ПРАКТИКА БЫЛА И МЫ ЭТОТ ПРИСТРОЕК К СТАРОЙ ШКОЛЕ СТРОИЛИ. И КОГДА РЫЛИ ТРАНШЕЮ ПОД ФУНДАМЕНТ, ОТКОПАЛИ ЯЩИКИ, ОСТАНКИ. ТАМ СПЛОШЬ ЭТИ ЗАХОРОНЕНИЯ. ЯМА БЫЛА ОГРОМНАЯ. ДАЖЕ В ДОКУМЕНТАХ СВИДЕТЕЛЬСТВА ЕСТЬ, ЧТО КОГДА СТАЛА ОТТАИВАТЬ, ЗАПАХ СТАЛ РАСПРОСТРАНЯТЬСЯ. КОНЕЧНО, СТОЛЬКО ЛЮДЕЙ ТАМ ПОГРЕБЕНО БЫЛО. БОЛЬШЕ ТЫСЯЧИ ЧЕЛОВЕК. ЗДЕСЬ И ВОТ ТАМ, ГДЕ ПАМЯТНИК СТОИТ, ВТОРАЯ ЯМА БЫЛА. ■ А «ПОЛЕЗНЫХ» ЕВРЕЕВ ПОЗЖЕ ОТДЕЛЬНО РАССТРЕЛИВАЛИ. ТЕХ, КТО СУМЕЛ УБЕЖАТЬ ОТ ЭТОЙ ОБЛАВЫ 5-ГО МАРТА, ИХ ПОТОМ ВЫЛАВЛИВАЛИ. В КОНЦЕ ХОЛЬНЕВИЧСКОЙ, ВОЗЛЕ ШАЛАВАТКИ, РАССТРЕЛЯЛИ. У МЕНЯ ЕСТЬ СПИСКИ С ФАМИЛИЯМИ, Я ИХ БЕРЕГУ. НО ТАМ, КОНЕЧНО, НЕ ВСЕ. ■ ПОСЛЕ ГЕНОЦИДА НАЧАЛОСЬ МАРОДЕРСТВО. МНОГИЕ ВСПОМИНАЮТ, ЧТО В БЕДНЫХ ХАТАХ ПОЯВИЛИСЬ ТОГДА ЖЕЛЕЗНЫЕ КРОВАТИ С ЕВРЕЙСКИХ ДОМОВ. ВСЯ ИСТОРИЯ ЧЕРЕИ БЫЛА В ЕВРЕЙСКИХ ДОМАХ, КОТОРАЯ БЫЛА СОЖЖЕНА, РАЗГРАБЛЕНА И УНИЧТОЖЕНА ВО ВРЕМЯ СОРОК ВТОРОГО ГОДА



## БЭЗАВАЯ АЛЕЯ

Стварэнне ў мястэчку бэзавых алей – гісторыя яскравага захаплення. Дзякуючы Мілашам, у XIX стагоддзі на шляху да сядзібнага дома з'явілася 126 гатункаў гэтае расліны. З цягам часу бэз упрыгожыў шмат якія чарэйскія вуліцы.

У красавіку 2019 года аўтары праекта «Чарэя. Інтэрактыўны гід» пачалі адраджаць бэзавы космас.



## МЕСЦА СЯДЗІБЫ МІЛАШАЎ

*Мілашаў дом быў бальшы і длінны-длінны. Да вайны то школа беларуская была. Там раяль стаяў, балаваліся на этым раялі мы. І сад быў!*

*Дмитрий Степанович Пушнов*

Драўляны дом у стылі ампір у выглядзе падковы перайшоў ад Сапегаў да Мілашаў пры канцы XVIII стагоддзя. Яго абступалі сады, за якімі пачынаўся вялікі пейзажавы парк з ліпавымі ды вярбовымі прысадамі, а ўздоўж вербаў з пагорка сыходзілі каскадам саджалкі. Увесну да іх вады зляталіся белыя і чорныя лебедзі. Была ў сядзібе аранжарэя з экзатычнымі раслінамі ды нават паветраны шар – Уладзіслава Мілаша, бацьку Оскара, цікавілі падарожжы, навуковыя і тэхнічныя вынаходкі.

У 1906 годзе апошнія ўладальнікі маёнтка – маці ды сын, Марыя і Оскар – пакінулі родавае гняздо. У часе першае сусветнае вайны ў мястэчка ненадоўга вярну- лася Марыя, тады ў доме зрабілі вайсковы шпіталь. Калі сюды дабраліся камунары, яны паводзіліся, як вандалы. У 1922 годзе, жадаючы паказаць родныя мясціны сябру, у Чарэю прыехаў Оскар, і ўбачыў у сядзібе поўнае запусценне. Пасля таго колькі гадоў у доме мес- цілася школа, а ў часе другой сусветнае вайны яго амаль цалкам зруйнавалі, засталіся адно лёхі. У 50-я гады на гэтым месцы зноў з'явілася школа, будынак якой цяпер перад вамі.

# ЛІПАВАЯ АЛЕЯ

Ступіце ў ліпавую аркаду, улюбёную алею некалькіх пакаленняў мясцовых жыхароў, – і дрэвы паступова заглыбяць вас у пазачасавы стан. Сярод чарэйскіх ліпаў здабываецца таямніца яднання з прыродаю і з мястэчкам.

Гэтая алея, створаная Сапегамі, раней была часткаю вялікага парку. Скрозь выцінанкі-цені, пад акенцамі спаміж галінаў вы прыйдзеце ў кола з пракаветных ліпаў – да найвышэйшае кропкі мястэчка, дзе захавалася аснова старадаўняй альтанкі. Злева за дрэвамі – яшчэ адзін падарунак ад алеі: краявід-падарожжа – з Чарэі праз возера ў Белую Царкву. А непадалёку, на беразе сажалкі, першае з колішняга каскада, архітэктары школы SESAM Ex Nihilo у 2018 годзе сканструявалі альтанку для медытацыі.

*Там жа вакол такія ліпы стаялі, у два рады. Чорт це знаець колькі ім гадоў! Сапегі садзілі, ці бог іх знаець, хто тады камандаваў. У тры абхвата – такія ліпы! Высокія...*

*Дмитрий Степанович Пушнов*



*Тут ліпы былі, во мы бы ўдваёх не абнялі, бальшыя-бальшыя ліпы.*

*Лариса Савельевна Демидёнок*

# ПАХАВАЛЬНЯ МІЛАШАЎ

Цагляныя скляпенні ля каталіцкіх могілак – родавая пахавальня Мілашаў. Тут было месца спачыну Артура, Наталлі ды Уладзіслава – дзядулі, бабулі ды бацькі Оскара, пісьменніка і філосафа. У пачатку XX стагоддзя склеп зачынілі, у 1936 годзе пабурылі, і цяпер унутры яго пуста. Штовясну ля руінаў зацвітае бэз – водгулле прысадаў, створаных сям'ёю на шляху да дома.





*Цяпер мы к озеру хадзіць сталі. Імяніны – туда заходзім, пажалуста. На Ўзваллі сядзіш, можна і выпіць, кала возера пасядзець. Дзе качэлі пастроілі. Унукі прыязджалі, пакаталіся. Нас там і сфатаграфіравалі. Харошыя качэлі, нічога. Дзеці любяць качацца, як прыязджаюць. Саседзі ж во глядзяць, каб не абламілі там што. Называецца – Узвалле, бераг такі высокі.*

*Владимир Андреевич*
*и Мария Васильевна Миновичи*

# ТРАЕЦКАЯ (БЕЛАЯ) ЦАРКВА

Паўвыспа Чарэйскага возера зберагла сапраўдны цуд.

Паводле адной версіі, Траецкую царкву стварыў у 1599 годзе Леў Сапега, калі адраджаў мясцовы манастыр. Ужо праз некалькі гадоў бажніца і манастыр прынялі ўнію, падпарадкаваліся базыльянскаму ордэну. Паводле другой версіі – царкву тады толькі аднавілі і пабялілі, дзякуючы чаму яе пачалі называць яшчэ і Белаю. А заклаў бажніцу Багдан Сапега з удзелам італьянскага архітэктара Арыстоцеля Ф'ёраванці ў 1475 годзе. Так ці інакш, Беларусь захоўвае ўнікальны ўзор ранняга барока. Галоўнае дзіва – скляпенні з вялікім пралётам без апораў: зойдзеце ў царкву, зойме дых. У XVII стагоддзі ў галоўным алтары размяшчаўся цудадзейны абраз Чарэйскае Божае Маці. Над алтаром вы ўбачылі б разныя драўляныя аблокі, апраўленыя промнямі, а ў цэнтры іх – Святую Троіцу, выяўленую таксама выразанымі з дрэва фігурамі. Самы стары алтар бажніцы знаходзіўся ў бакавой капліцы (месцілася справа ад уваходу, не захавалася). У склепах пад капліцаю і галоўным алтаром былі пахаваныя продкі Льва Сапегі.



У пачатку XVIII стагоддзя над уваходнымі дзвярыма ў галоўную бажніцу з'явіўся абраз Езуса Міласэрнага, а вышэй над карнізам – статуя Езуса, які сядзеў у нішы, з двума анёламі па баках. Лесвіца злева ад уваходу, што захавалася да сёння, у сцяне двухметровае таўшчыні (напэўна, калі будавалі бажніцу, прадчувалі, што ёй прыйдзецца перажыць няпросты час) тады вяла да чатырох званоў.
Пасля Полацкага сабору царква стала праваслаўнай і была нязначна перабудавана.
У 1929 годзе царкву зачынілі, ператварылі ў збожжасховішча, пасля спрабавалі зруйнаваць. У 80-я гады яе выкарыстоўвалі для практыкаванняў альпіністы.
Зараз бажніца чакае новага перыяду сваёй багатай гісторыі.

*Тут раней ні адной хаты не было. Цэрква і пан. Вон там жыў, наўпроць кладбішча. Там акацыяй дарога яго высаджана была, яшчэ і цяпер во акацыя расцець.*

*У вайну немцы цэркаў не кранулі. Нічаго не адарвалі. Дык пасля ж вайны стаяла цэленькая. І кумпала, і палы, і ўсё было цэленькае-цэленькае! А красівая ж была! Там за этым кумпалам такі шасціграннік быў з дасок зделаты, у тры доскі. Такая красата! А там вунь, дзе загарадзілі, эта ж усё была цэрква. Збоку былі паповы кабінеты. Поп з іх выходзіў у цэркву, там маліўся, ксціўся – усё гэта было яго дзела. А патом раённы зернасклад быў, поўную зярна насыпалі. Каўхозы вязлі, нарубцоўка была здаць каўхозу там сколькі тон, усе вязлі-здавалі ў цэркаў, поўную насыпалі. А тады кумуністы – пыў!.. Ну давай ламіць! Ламілі каму ня лень. Зломілі ўсё.*

*Спіртзавод быў. Эта к лесу туда, прама дзержы, і там за каналам. А кірпічны завод правей троху. Там труба яшчэ тырчыць.*

*А тут ніводнага дзерава на востраве не было, толькі адны вішні, слівы, ігрушы і яблыні. Такі сад быў! Так і называўся «Папоў сад». Тут страшна было глядзець – усё красненькае, адны вішні! Красіва, што ты!..*

*Николай Иванович*


БЦ

# СЦЭНА

У часе першага фестывалю SPRAVA, што адбыўся ў 2017 годзе, міжнародная каманда сталяроў і архітэктараў стварыла сцэну – для канцэртаў, лекцыяў і майстар-класаў, адпачынку і засяроджвання. Аўтарам архітэктурнага праекта выступіў Сяргей Краўчанка.

Сцэна зробленая з лістоўніцы. Гэта надзвычай даўгавечная парода дрэва, што не толькі вядомая трываласцю і мае бездакорную рэпутацыю, але і валодае лекавымі ўласцівасцямі. Кажуць, што, дакрануўшыся да лістоўніцы і крыху пасядзеўшы побач, можна пачуць нутраное святло і зрабіцца крыху больш шчаслівым. Напэўна, таму сцэну гэтак палюбілі музыкі ды слухачы. На ёй выступалі SHUMA, PORT MONE, ГРЁЗЫ ПАФНУТИЯ, ТРОІЦА, ULIANICA, DEE TREE, YAHOR JEIHALO, Аркестр ОКО ды іншыя.



# ПЛЯЖ

Калі вы пройдзеце паўвостраў наскрозь, паўз руіны Траецкае бажніцы, пладовыя дрэвы колішніх садоў, пакінеце злева дубовыя паляны ды скіруецеся проста на прасветліну ў лясной узбярэжнай паласе, то апынецеся ў дзівосным месцы, дзе хочацца пабыць даўжэй. Тут можна прысесці на прыступкі з лістоўніцы, што ліюцца каскадам з узвышша, затрымаўшы пагляд на чаротавай вадзе або скіраваўшы яго ўгару, да неба ў дубовых галінах. А можна сысці ніжэй, да плыта, што дрэйфуе пад пяшчотным сонцам, і ўволю паплаваць.

Пляж стварылі ў 2018 годзе. Спачатку ўдзельнікі міжнароднае архітэктурнае школы SESAM Ex Nihilo рэалізавалі праект PLATFORMIX – сканструявалі плывучую платформу для пікнікоў на вадзе (цьютары – беларусы Анастасія Лемяшонак ды Ілля Катлярскі). Пасля архітэктар Сяргей Краўчанка распрацаваў макет пляжа-пірса, да якога б платформа магла прымацоўвацца. На другім фестывалі SPRAVA каманда сталяроў і цесляроў гэтую ідэю ажыццявіла.



# ЧАРЭЯ І БЕЛАЯ ЦАРКВА Ў МАЛЮНКАХ І ЎСПАМІНАХ




- Аўтары ідэі – Каця Аверкава, Агнія Асановіч
- Ілюстратар – Ганна Крук
- Дызайн, вёрстка – Максім Осіпаў
- Работа з гістарычным матэрыялам – Насця Качан, Таццяна Козлоўская, Андрэй Беларэцкі
- Інтэрв'юэр – Каця Аверкава
- Веб-дызайн – Ганна Пермінава, Матвей Сабураў
- PR – Аліна Крушынская, Крысціна Грэкава
- Фота – Таня Капітонава

Каардынатар праекта – Каця Аверкава,

Праект рэалізаваны ініцыятыўнай групай SPRAVA пры садзейнічанні Міжнароднай некамерцыйнай арганізацыі Pact і падтрымцы Агенцтва ЗША па міжнародным развіцці (USAID).

Дзякуем за дапамогу Чашніцкі раённы выканаўчы камітэт і асабіста Аляксандра Сурына і Аляксандра Косава, Лукомльскі сельскі выканаўчы камітэт і асабіста Н'ллі Гамбарян, Яўгена Антюкова і магазін «Строймастер» г. Новалукомля, Максіма Квартальнага, Рыгора Гольдберга, нашых валанцёраў.


chareaplace@gmail.com

**charea.spravafestival.by**

USAID FROM THE AMERICAN PEOPLE

pact building local promise.

SPRAVA ФЕСТИВАЛЬ